Макрушыч, А. М. Удзел дзяржаўных структур у развіцці традыцыйнай культуры беларусаў у канцы ХХ – пачатку ХХI ст. / А. М. Макрушыч // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 192 – 197

**А. М. МАКРУШЫЧ**

# УДЗЕЛ ДЗЯРЖАЎНЫХ СТРУКТУР У РАЗВІЦЦІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ У КАНЦЫ ХХ – ПАЧАТКУ ХХI ст

У канцы ХХ – пачатку ХХI ст. аб’ектыўнай рэальнасцю ў жыцці чалавецтва сталі працэссы глабалізацыі, якія ў культурнай сферы праявіліся неадназначна. З аднаго боку, прызнанымі «плюсамі» глабалізацыі з’яўляюцца пашырэнне культурнага абмену, шырокія магчымасці для павышэння свайго культурнага і адукацыйнага ўзроўню. З іншага боку, адным з негатыўных наступстваў глабалізацыі з’яўляецца паступовае знікненне этнічных (традыцыйных) культур, у выніку чаго адбываецца размыванне этнічнай ідэнтычнасці і самасвядомасці людзей.

Неабходнасць захавання этнічнай культуры абумоўлена яе значнасцю ў жыцці грамадства. Этнакультура аб’ядноўвае індывідуумаў у адзіны этнас, з’яўляецца фундаментальным базісам нацыянальнай культуры, адным з найважнейшых складальнікаў мастацкай адукацыі. У сучасных умовах, калі усё менш элементаў традыцыйнай культуры захоўваецца ў жыцці людзей, узрастае неабходнасць арганізацыі спецыяльных мерапрыемстваў па ахове і зберажэнні гэтай часткі культурнай спадчыны. Удзел менавіта дзяржаўных органаў у справе захавання фальклору, народных промыслаў і рамёстваў абумоўлены тым фактам, што дадзеная сфера не забяспечвае атрымання высокіх даходаў і таму доля прыватных інвестыцый у падтрымке этнакультуры невялікая.

У незалежнай Беларусі ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў сферы традыцыйнай культуры беларусаў актывізавалася з 1991 г., калі быў прыняты Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь». У артыкуле 5 Закона сярод абавязкаў дзяржавы ў вобласці культуры адзначалася стварэнне гарантый і стымулаў захавання традыцыйнай культуры. Гэта палажэнне было пашырана ў артыкуле 19 «Традыцыйная



культура», дзе была прапісана неабходнасць аказання ўсебаковай падтрымкі развіццю традыцыйнай культуры ў цэлым і яе розных жанраў з боку рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады. У дадзеным Законе вызначаўся змест тэрміна «традыцыйная культура». Яна ўключала аўтэнтычны фальклор, звычаі, абрады, святы, традыцыйныя здабычы і рамёствы і інш. [2].

Дзяржаўная пазіцыя ў адносінах традыцыйнай культуры была найбольш поўна агучана 27–28 сакавіка 1997 г. на выязным паседжанні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у г. Лепелі. На калегіі было падкрэслена, што асаблівасцю Беларусі ў культурным свеце з’яўляецца наяўнасць традыцыйнага фальклору як жывой з’явы, таму асноўная мэта ўсіх формаў працы з ім – падтрымліваць жыццё традыцыі, надаваць новыя імпульсы для існавання розным формам аўтэнтычнага фальклору. Роля дзяржавы складаецца ў стварэнні прадуманай сістэмы мер і метадаў, якія б садзейнічалі арганічнаму ўваходжанню каштоўнасцяў традыцыйнай культуры ў сучасны нацыянальна-культурны працэс [12, л. 123]. Таксама ў 1997 г. у г. Мінску адбылася VI Еўрапейская канферэнцыя Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці «Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы». Матэрыялы канферэнцыі адкрываў артыкул намесніка Міністра культуры Рэспублікі Беларусь В. К. Гедройца, у якім адзначалася, што фальклор стаіць ля вытокаў фармавання прафесійнай мастацкай культуры і вызначае нацыянальна-самабытнае аблічча кожнага з яе відаў (літаратуры, музыкі, тэатра, і г. д.) [4, с. 7]. В. К. Гедройцам была звернута ўвага на пагрозу разбурэння аўтэнтычных формаў традыцыйнай культуры пад уздзеяннем сучаснай цывілізацыі і падкрэслена неабходнасць прыняцця дзяржавай мер па захаванні традыцыйнай культуры і ўключэнню яе каштоўнасцяў у нацыянальна-культурны працэс [4, с. 8].

Вышэйпералічаныя падзеі актывізавалі дзейнасць па распрацоўцы нарматыўных дакументаў для рэгулявання сферы традыцыйнай культуры беларусаў. Неабходнасць іх прыняцця была абумоўлена тым, што дагэтуль палітыка ў гэтай вобласці засноўвалася толькі на Законе «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», прынятым яшчэ ў 1991 г. Першым крокам у гэтым накірунку стала рашэнне калегіі Мінкультуры «Аб захаванні і падтрымцы традыцыйнай культуры» (сакавік 1997 г.). У дадзеным дакуменце было зафіксавана, што традыцыйная культура з’яўляецца ўнікальным багаццем краіны, магутным сродкам аб’яднання народа і ўмацаванні яго культурнай самабытнасці [12, л. 130]. Задачы аднаўлення, зберажэння, падтрымкі, аховы і папулярызацыі традыцыйнай культуры разглядаліся Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь як адно з прыярытэтных накірункаў культурнай палітыкі [12, л. 117]. Таксама ў дакуменце былі вызначаны асноўныя накірункі дзейнасці дзяржаўных структур па захаванні традыцыйнай культуры і дадзены пэўныя даручэнні адказным органам па яе падтрымцы.

У 1999 г. было зацверджана «Палажэнне аб аўтэнтычным фальклорным гурце ў Рэспубліцы Беларусь», у якім былі вызначаны парадак надання аўтэнтычнай групе статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, задачы яе кіраўніка, матэрыяльная база і фінансавая падтрымка аўтэнтычных фальклорных груп, абавязанні мяс-



цовых органаў улады ў стаўленні аўтэнтычных груп. Таксама ў 1999 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных промыслаў (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь» (№ 282-З) [3], які вызначыў асноўныя прынцыпы дзяржаўнага рэгулявання і падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслов (рамёстваў) як неад’емнай часткі нацыянальнай культуры і гісторыі беларускага народа. Некаторыя яго нормы былі ўдакладнены асобнымі нарматыўнымі дакументамі: «Палажэнне аб народным майстры» (2000 г.), «Палажэнне аб Цэнтры (Доме) рамёстваў» і «Палажэнне аб Нацыянальнай выстаўцы твораў народнага мастацтва» [8; 9].

У 2004 г. была прынята новая рэдакцыя Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь». У дадзеным дакуменце акцэнт быў перанесены на падтрымку народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), якія з’яўляюцца толькі часткай традыцыйнай культуры, а асобнага артыкула, прысвечанага традыцыйнай культуры ў цэлым, у Законе не было.

Для сістэматызацыі і ўзгаднення дзеянняў па захаванню традыцыйнай культуры з 1994 г. ў Беларусі практыкавалася распрацоўка і ўкараненне мэтавых праграм. Першай стала Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры на

1994–1996 гг. [7]. У далейшым увага гэтаму пытанню надавалася ў прыярытэтных накірунках культурнай палітыкі на 1997–2000 гг., Дзяржаўнай праграме «Функцыяніраванне и развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г. ». Найбольш значным і дэталёва распрацаваным дакументам у гэтай галіне стала «Дзяржаўная праграма па захаванню і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў ў Рэспубліцы Беларусь» (2001–2005 гг.). На рэгіянальным узроўні найбольш актыўна распрацоўваліся абласныя і раённыя праграммы па падтрымцы традыцыйнай культуры і яе розных праяў у Мінскай вобласці.

Асноўным дзяржаўным органам, які праводзіў этнакультурную палітыку, – Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь – у сваіх дакументах неаднаразова падкрэслівалася прыярытэтнасць захавання традыцыйнай культуры беларусаў і яе асноўных складнікаў у рамках дзейнасці яго падначаленых устаноў [11, л. 53; 13, л. 20; 14, л. 40]. Варта адзначыць, што Міністэрствам культуры часта ў якасці сіноніма або прыярытэтнага кірунку ў традыцыйнай культуры выкарыстоўвалася паняцце «фальклор». У рэгіёнах захаванне беларускага фальклора, народных рамёстваў з’яўлялася зместам дзейнасці абласных цэнтраў народнай творчасці, раённых метадычных цэнтраў і клубных устаноў [17, с. 687].

З пачатку 1990-х гг. у сістэме Міністэрства культуры пачалі ствараціца новыя установы, дзейнасць якіх была накіравана на рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў галіне традыцыйнай культуры. Гэта, перш за ўсё, Беларускі інстытут праблем культуры, створаны ў 1991 г. (з 2001 г. – Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры). У яго складзе працаваў аддзел народнай творчасці, які займаўся навукова-метадычным і арганізацыйным забяспячэннем развіцця народнай творчасці, даследаваннем беларускіх народных рамёстваў, фальклора, свят, абрадаў [17, с. 687].

У рэгіёнах у гэты час пачалося перапрафіліяванне клубных устаноў, выкліканае неабходнасцю захавання традыцыйнай культуры і адыходу ад неактуальных



форм працы. Новыя клубныя ўстановы, дзейнасць якіх была накіравана на захаванне і засваенне фальклору, народных промыслаў і рамёстваў падзяляліся на аднапрофільныя і шматпрофільныя. Да ліку першых адносіліся Дамы (Цэнтры) рамёстваў, супрацоўнікі якіх займаліся адраджэннем народных промыслаў і рамёстваў. Праца з рознымі формамі матэрыяльнай і духоўнай традыцыйнай культуры ажыццяўлялася ва ўстановах комплекснага характару, якія мелі розныя найменні пры падобных функцыях: Дамы (Цэнтры) фальклору, народнай творчасці, народных традыцый [15, з. 17]. Першы Дом рамёстваў быў створаны ў г. Глыбокае ў 1990 г., а ў 1992 г. існавала ўжо 12 падобных устаноў, усе – у Віцебскай вобласці [17, с. 687]. Трэба адзначыць, што і надалей падобных устаноў было больш за ўсё ў Віцебскай вобласці, тады як Дамы фальклору былі найбольш распаўсюджаны ў Гомельскай вобласці. Да 2006 г. у рэспубліцы было створана 87 Дамоў рамёстваў і народных майстроў, 63 Дамы фальклору, народнай творчасці [5, с. 28].

Даследаваннем і захоўваннем фальклору ў фіксаваных формах займаліся навуковыя і вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі, а таксама ў гэту працу з сярэдзіны 1990-х гг. уключыліся культурна-асветніцкія ўстановы (абласныя цэнтры народнай творчасці, раённыя метадычныя цэнтры, клубныя

ўстановы). Да 2005 г. быў назапашаны вялізны аб'ём фальклорных матэрыялаў у розных формах захоўвання (напрыклад, у фальклорным архіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі налічвалася звыш 60 тыс. фоназапісаў і каля 120 тыс. тэкставых запісаў [10, с. 144]. Матэрыяльныя праявы традыцыйнай культуры збіраліся і сістэматызаваліся дзяржаўнымі музеямі рэспублікі, у 1990-х гг. з'явіўся шэраг новых этнаграфічных музеяў («Млын», Мотальскі музей народнай творчасці, «Палеская веда» і інш.).

Як частка культурнай дзейнасці людзей традыцыйная культура захоўвалася аўтэнтычнымі фальклорнымі групамі і самадзейнымі фальклорнымі калектывамі, аматарскімі аб'яднаннямі, народнымі майстрамі. У 1991–2005 гг. гэта дзейнасць ажыццяўлялася пераважна з мэтай самавыяўлення ўдзельнікаў і сцэнічнага прадстаўлення творчасці, і ў значна меншай ступені – як традыцыйная форма вольнага часу і спосаб заробку (напрыклад, выраб вырабаў народных рамёстваў). Большасць калектываў і індывідуальных удзельнікаў дзейнічала пад эгідай клубных устаноў культуры, якія аказвалі ім метадычную і арганізацыйную дапамогу.

Заахвочванне дзеячаў і арганізацый, якія адраджаюць традыцыйную культуру, ажыццяўлялася праз прысуджэнне ганаровых званняў, прэмій, стыпендый. Яно актывізавалася з канца 1990-х гг., калі былі заснаваны спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтвы [6], стыпендыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Прысваенне ганаровых званняў было больш распаўсюджаным для фальклорных калектываў. Яшчэ з часоў БССР захавалася практыка надання звання «народны» («узорны»), што падкрэслівала творчыя дасягненні калектыву і стымулявала матэрыяльна. З 2004 г. было уведзена новае пачэснае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь», для атрымання якога калектывам трэба было арыентавацца ў сваёй дзейнасці на



аўтэнтычны фальклор [1]. Адрасная матэрыяльная дапамога ў выглядзе прэмій і стыпендый часцей прызначаліся народным майстрам [16, с. 51].

Папулярызацыя творчасці фальклорных калектываў і народных майстроў ажыццяўлялася праз фальклорныя фестывалі, святы і выставы рамёстваў. Сярод іх трэба адзначыць фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы, з 1991 г.), Першы міжнародны фестываль фальклору (1994 г., Пінск), фестывалі народнага танцу «Беларуская полька» (1993, 1994, 1996, 1999 гг., Чачэрск), фальклорныя фестывалі «Берагіня» (1998–1999, 2001–2002, 2003–2004,

2005–2006 гг., п. Акцябрскі) і інш. Шэраг з іх сталі традыцыйнымі, некаторыя засталіся адзінкавай акцыяй. З другой паловы 1990-х гг. пачалося правядзенне свят-конкурсаў рамёстваў, якія арганізоўвалі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускі саюз майстроў народнай творчасці.

Такім чынам, можна зрабіць наступныя высновы, што ў 1990-х – пачатку 2000-х гг. захаванне традыцыйнай культуры беларусаў у аўтэнтычных і рэпрадуктыўных формах з'яўлялася прэрагатывай дзяржаўных арганізацый, у прыватнасці, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Вялася распрацоўка заканадаўства для рэгулявання гэтай галіны культуры, аднак асобнага закону «Аб традыцыйнай культуры» створана не было. Можна вызначыць два асноўных накірункі дзейнасці дзяржаўных устаноў у сферы традыцыйнай культуры. Адным з іх з'яўляецца збор і зберажэнне аўтэнтычнага фальклору ў фіксаваных формах, прадметаў народных рамёстваў (промыслаў). Захаванне праяў традыцыйнай культуры ў творчасці людзей ажыццяўлялася праз дзейнасць фальклорных калектываў, аматарскіх аб'яднанняў, народных майстроў, якія працавалі на базе клубных і культурна-асветніцкіх устаноў. З канца 1990-х гг. актывізавалася заахвочванне дзеячаў і арганізацый, звязаных са сферай традыцыйнай культуры, праз прысуджэнне спецыяльных прэмій і грантаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, стыпендый Міністэрства культуры. Папулярызацыя традыцыйнай культуры ажыццяўлялася праз арганізацыю фальклорных фестываляў, выстаў і свят народных рамёстваў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку надання звання «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь»: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 2 ліст. 2001 г., № 1609 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2001. – № 105. – 5/9332.

2. Аб культуры ў Беларускай ССР: Закон БССР, 4 чэрв. 1991 г., № 832-XII // Ведамасці Вярхоўн. Савета БССР. – 1991. – № 20. – Ст. 291.

3. Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 9 ліп. 1999 г., № 282-3 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 1999. – № 56. – 2/62.

4. *Гедройц, В.* Народная культура Беларусі на сучасным этапе: праблемы і перспектывы / В. Гедройц // Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы: матэрыялы VI Еўрап. канф. Міжнар. арганізацыі па народнай творчасці (IOV), Мінск, 23–26 верас. 1997 г. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, БелДІПК; пад агул. рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск, 2001. – С. 7–10.

5. Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.:галіновая праграма, зацв. калегіяй Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь, 30 мая 2006 г.,

№ 40 / У. П. Рылатка [і інш.]; М-ва культуры Рэсп. Беларусь; пад агул. кіраўн. У. Ф. Матвейчука. – Мінск, 2006. – 168 с.

6. О специальных премиях и грантах Президента Республики Беларусь деятелям культуры и искусства: Указ Президента Респ. Беларусь, 23 июня 1998 г., № 328 // Зборнік міжнародных і рэспубліканскіх дакументаў аб нацыянальна-культурным развіцці нацыянальных супольнасцей Беларусі / Дзярж. кам. па справах рэлігій і нацыянальнацей Рэсп. Беларусь; рэд. савет: А. М. Білык [і інш.]; склад. Н. В. Ходар. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1998. – С. 99–102.

7. Об утверждении Программы государственной поддержки традиционной культуры на 1994–1996 гг.: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 11 нояб. 1993 г., № 779 // Збор пастаноў Урада Рэсп. Беларусь. – 1993. – № 32. – Арт. 625.

8. Палажэнне аб Нацыянальнай выстаўцы твораў народнага мастацтва: зацв. Пастановай Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь, 8 чэрв. 2000 г., № 12 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2000. – № 60. – 8/3617.

9. Палажэнне аб Цэнтры (Доме) рамёстваў: зацв. Міністрам культуры Рэсп. Беларусь, 18 студз. 2000 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2000. – № 24. – 8/2757.

10. Палявая фалькларыстыка і этнаграфія: метадалогія, адкрыцці, праблемы: інфарм. бюлетэнь семінара // Веснік БелДІПК. – 2004. – № 1. – С. 143–155.

11. Постановления № 1–41 коллегии Министерства и документы к ним (22.02.– 31.12.1993 г.) // Архив Министерства культуры Республики Беларусь. – Фонд 974. – Оп. 4. – Д. 3. – 134 л.

12. Протоколы № 3–5 заседаний коллегии Министерства и документы к ним (5.03.1997 – 24.04.1997 г.) // Текущий архив Министерства культуры Республики Беларусь. – Фонд 974. – 279 л.

13. Протоколы № 2–6 заседаний коллегии министерства и документы к ним (03.06.1996 – 30.09.1996 г.) // Текущий архив Министерства культуры Республики Беларусь. – Фонд 974. – 207 л.

14. Протоколы № 1–2 заседаний коллегии Министерства и документы к ним (29.01.1999 – 26.02.1999 г.) // Текущий архив Министерства культуры Республики Беларусь. – Фонд 974. – 228 л.

15. *Сасноўскі, А.* Праблемы і перспектывы дзейнасці органаў і ўстаноў культуры рэспублікі / А. Сасноўскі // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: інфарм.-аналіт. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1999. – Вып. 6. – С. 13–36.

16. *Сахута, Я.* Жывыя крыніцы / Я. Сахута // Беларусь. – 1998. – № 1. – С. 50–51.

17. *Сивурова, Л. П.* Любительское художественное творчество / Л. П. Сивурова // Современная Беларусь: энцикл. справ.: в 3 т. – Минск: Белорусская наука, 2007. – Т. 3: Культура и искусство. – С. 685–729.